УДК 070.11(476)

С.У. Дзядзінкіна

# Дэанталагічная праблематыка журналісцкай працы над судовым нарысам

У беларускай журналістыцы не разглядаліся ні матывацыя існавання медыя-тэкстаў паводле разгляду судовых спраў, ні дэанталагічныя асновы гэтага жанру, ні яго гнасеалагічныя задачы. Але сярод публіцыстычных тэкстаў судовы нарыс займае трывалае месца. Рэпартажы, паведамленні пра разгляд тых ці іншых судовых спраў узніклі з часу нараджэння сродкаў камунікацыі. Антычныя рытары старажытнага Рыма Корак і Тысій выступалі на судовых пасяджэннях, што дазволіла нашым сучаснікам назваць тагачасны Рым «грамадствам камунікацыі» [1]. Звернем увагу і на тое, што менавіта Корак быў аўтарам методыкі пабудовы прамовы, якая склала аснову выкладу аргументаў. Канцэпцыя рыторыкі, што дайшла да нас з тых часоў, мела наступную структуру: прамова пачыналася з уступу, які быў патрэбны для таго, каб падрыхтаваць публіку; факты выкладаліся ў апавядальнай частцы, а потым абмяркоўваліся ў доказнай; заключная ж частка ставіла на мэце зрабіць ураджанне на прысутных.

Найноўшая сучасная журналістыка ўзяла судовы нарыс на ўзбраенне як адзін з выразных інструментаў заахвочвання аўдыторыі да друкаваных перыядычных выданняў. Калі сацыяльная праблематыка беларускіх друкаваных сродкаў масавай інфармацыі (СМІ) псіхалагічна блізкая да чытацкай аўдыторыі, па тлумачэнні С.В. Дубовіка [2] (сацыяльны – значыць грамадскі, які адносіцца да жыцця людзей і адносін паміж імі), то судова-прававая праблематыка ўяўляе сабой пэўны зрэз сацыяльных адносін, якія маюць важнейшае значэнне ў жыцці кожнага чалавека. Табліца рэйтынгу тэм, што цікавяць чытачоў розных газет, засведчыла: самы высокі працэнт належыць у рэйтынгу «крымінальным хронікам» (ад 29,9% у чытачоў «Звязды» да 73,5% у чытачоў «Народнай газеты»). Характэрна, што ў розных узроставых групах чытачоў крымінальная тэма зноў-такі лідзіруе сярод іншых тэматычных кірункаў: у моладзі – 59,6-64,7%, самы высокі працэнт цікавасці – ва ўзроставай групе 35-44 гадоў – 70,1% [2, с. 55]. Безумоўна, *паняцце «крымінал» некалькі звужанае для асэнсавання анталогіі судовага нарыса, у якім найпершаснае значэнне надаецца маральна-прававому аспекту тэкставага матэрыялу. У спалучэнні логіка-рацыянальнага і эмацыянальна-вобразнага нарысіст дасягае большай эфектыўнасці ва ўздзеянні на чытача.*

Частата аднаўлення спецыфічных карцін крымінальных падзей, якія звычайна апісваюцца ў судовых нарысах, выклікае слушную трывогу ў псіхолагаў: экспазіцыя ўзораў сацыяльнага гвалту можа ўзброіць людзей новымі мадэлямі агрэсіўных паводзін, якія не ўваходзілі раней у іх паводзінавы рэпертуар. Аднак эфект уздзеяння мас-медыя на праяўленне чалавечай агрэсіўнасці даволі супярэчлівы. Аддзел юрыдычнай псіхалогіі НІІ пры Генеральнай пракуратуры Расійскай Федэрацыі правёў маніторынг па выяўленні фактаў трансляцыі гвалту СМІ і вывучэнні прыроды гэтай з'явы. Па выніках даследавання ўстаноўлена, што адна з прычын трансляцыі СМІ актаў

гвалту хаваецца ва ўласцівасцях чалавечай псіхікі: журналіст пры апісанні крымінальных падзей адчувае страх перад гвалтам, імкнецца збавіцца ад яго, пераадолець, што і адбываецца ў час аповеду пра гэта іншым. Стыль і характар выкладання фактаў можа быць розным і залежыць ад асаблівасцей асобы аўтара і тыпу яго рэакцыі (бравада, прымяншэнне небяспекі, іронія, змрочны гумар, страх, паніка, істэрыя) на сацыяльныя фактары. У сувязі з гэтым вызначаюцца розныя віды злоўжыванняў аўтараў публіцыстычных тэкстаў:

1) смакаванне падрабязнасцяў крымінальнага гвалту;
2) апісанне тэхналогіі здарэння злачынства;
3) нагнятанне страху, бяссілля перад злачынствам;
4) гумарыстычнае выкладанне хронікі здарэнняў;
5) гераізацыя і міфалагізацыя злачыннасці;
6) тэндэнцыйнасць у падачы матэрыялу.

Маніторынг паказаў таксама, што адпаведныя выдаткі абумоўлены злоўжываннем свабодай СМІ, нясталасцю асоб аўтараў публікацый, а таксама празмернай кар'ернай арыентацыяй.

*Дэанталагічная праблематыка журналісцкай працы над судовым нарысам хаваецца перш за ўсё ва ўнутраным ланцужку «журналіст – крыніца інфармацыі – журналіст – рэчаіснасць – журналіст – персанаж твора».* Паняцце «дэанталогія» ў навукова-журналісцкае асяроддзе яшчэ толькі ўваходзіць, хаця вядомае яшчэ з 1834 па кнізе І. Бентама «Deontology or the Science of Morality» («Дэанталогія, або навука аб маралі»). Дэанталогія – сістэма патрабаванняў, норм, прынцыпаў належных прафесійных паводзін. Як вучэбная і навуковая дысцыпліна, яна з'явілася адказам на патрэбу ў сістэме навуковых ведаў пра абавязак і нормы належных паводзін людзей у рэальнай грамадскай практыцы [3]. Менавіта ў сферы судова-прававых тэкстаў ад журналіста патрабуецца найбольш дасканалае валоданне нормамі прафесійных паводзін, а таксама практычным досведам у галіне пошуку інфармацыі. Судовыя справы, якія разглядаюцца штодня ва ўстановах трэцяй улады, не могуць аднолькава выклікаць цікавасць з боку мас-медыя. Журналіст заўсёды шукае справу, што мае шырокі грамадскі рэзананс па прычыне значнасці грамадскай небяспекі ўчыненага, або неардынарную, парадаксальную сітуацыю, высветліць прычыны якой – справа гонару прафесійнага рэпарцёра. Можа існаваць проста маленькі кручок, зачэпка, з дапамогай якога журналіст пачынае расследаванне (ад выпадковага ўчынку да шырокіх абагульненняў). Так ці інакш, але ад пабудовы трывалых кантактаў з афіцыйнымі крыніцамі інфармацыі залежыць сапраўдны поспех пошуку неабходнага матэрыялу. Перашкод у пабудове кантактаў у сістэме «журналіст – крыніца інфармацыі» шмат. Большасць з іх упіраецца ў псіхалагічны аспект: юрысты часцей не давяраюць прадстаўнікам СМІ, адкрыта заяўляюць ім пра гэта, бо набылі ўжо пэўны вопыт, часам сутыкнуўшыся з нядбайнасцю, недасведчанасцю, неахайнасцю работнікаў масавай камунікацыі. Журналіст вымушаны затрачваць час на тое, каб заваяваць давер патэнцыяльных крыніц інфармацыі.

Першая ў краіне судовая справа так званых скінхедаў, якая разглядалася восенню 2002 года калегіяй па крымінальных справах Віцебскага абласнога суда, прыцягнула ўвагу многіх медыйных сродкаў. Журналісцкую цікавасць да гэтай тэмы падмацоўвала жаданне «вынайсці» сенсацыю сярод падобных адзін на адно па жорсткасці і цынізму крымінальных спраў. А тут быццам бы свае, спечаныя, дамарослыя «нацысты». На пачатак судовага працэсу сабраліся журналісты розных друкаваных і электронных СМІ. Якой-небудзь іншай грамадскасці ў судовай зале заўважана не было. Па просьбе бацькоў і

абаронцаў непаўналетніх абвінавачваемых на лаве падсудных суд забараняе фота- і відэаздымку, карыстаючыся пэўным артыкулам Крымінальна-працэсуальнага кодэкса ў інтарэсах саміх жа непаўналетніх. Аднак праз дзень, 20 лістапада 2002 года, у газеце «Советская Белоруссия» на першай паласе пад рубрыкай «Громкое дело» з'яўляецца карэспандэнцыя Генадзя Закржэўскага «Свастика – знак подонков!», праілюстраваная фотаздымкам: маладыя «скіны» на лаве падсудных. У самім лідзе зроблены ясны ацэначны акцэнт: «И куда подевались наглость и бравада *нацистов*? Сегодня *у молодых фашистов* тяжелые времена – на скамью подсудимых сели четверо их соратников, обвиняемых по статье 130 Уголовного кодекса («Разжигание расовой, национальной, религиозной вражды или розни»). І далей па тэксце: «Беспрецедентный в судебной практике Беларуси процесс начался позавчера с получасовым опозданием. Первым делом судьи *добились выдворения* из зала судебных заседаний фото- и телерепортеров. Адвокаты обвиняемых требовали большего – объявления процесса закрытым, но судья их ходатайство отклонил». Аказалася – часова. Пададзеная «пад такім соусам» публікацыя выклікала «шок» у правасуддзя: журналісцкае слова прагучала як судовы прысуд, які павінен злачынцаў назваць злачынцамі, дакладна дыферэнцыраваць віну кожнага з падсудных. Журналіст зрабіў абагульненні, каб узмацніць сацыяльную праблему маладзёжнага асяроддзя, якую нельга вырашыць аднымі сілавымі і судовымі метадамі, але ці варта было выкарыстоўваць у тэксце такія недвухсэнсавыя вызначэнні, якія маюць для абвінавачваемых лёсавызначальнае значэнне?

Пэўная тэндэнцыйнасць у стварэнні публіцыстычнага тэксту па гэтай судовай справе задоўга да вынясення прысуду прасочваецца і ў матэрыяле абласной газеты «Віцебскі рабочы» (23 лістапада 2002 года) «Грэй, Гога и другие коршуны». Журналіст Міхаіл Прыгожы пачаў свой судовы нарыс з метафарычнага апісання злачынстваў, якія яшчэ па каліву даследуе судовая калегія. «Схема *насилия в отношении иностранцев*, взятая на вооружение скинхедами витебского розлива, на удивление проста: алкоголь приводит смесь жестокости, ненависти и скуки к взрыву. Судебная коллегия по уголовным делам областного суда под председательством Валентины Михайловны Буевой рассматривает дело «бритоголовых», которые коршунами налетали на выходцев из афроазиатского региона, обучающихся в ВГМУ, и *унижали их достоинство, избивали, грабили*, требуя от потерпевших покидать пределы Беларуси, поскольку иноверцы, по логике *бесчинствующих молодчиков*, ухудшают генофонд славянской нации, распространяют наркотическое зелье, другую заразу, являются источником террористических актов. Словом, персона «нон-грата». Такім чынам, суду быццам бы і няма чаго разбірацца, дапытваць сведкаў і пацярпелых. Журналісты заўчасна расставілі ўсе кропкі над і, вынеслі свой вердыкт, сфарміраваўшы грамадскую думку аб дадзеным працэсе. Такім чынам, прадстаўнікі СМІ аказаліся самі падобныя на драпежных коршунаў у дадзенай сітуацыі. Агульнавядомыя маральна-этычныя нормы прафесійных паводзін былі парушаны.

Толькі суд мае права назваць злачынца злачынцам, у гэтай аксіёме тоіцца сутнасць прэзумпцыі невінаватасці. Менавіта прыведзеныя вышэй публікацыі ў друку падштурхнулі суд, нарэшце, аб'явіць наступныя пасяджэнні закрытымі, што таксама стварыла новы прэцэдэнт.

Найбольш стрыманымі ў падачы дадзенага матэрыялу аказаліся абласная газета «Народнае слова» і гарадская газета «Віцьбічы», якія надрукавалі тэксты з нейтральнымі, дакладнымі і даволі змястоўнымі загалоўкамі: «Скинхеды призывали «гасить» иностранцев» («НС»19.11.2002 г.), «В ряды скинхедов мы попали случайно...» («В»22.11.2002 г.), «Суровый приговор

скинхедам» («НС»17.12.2002 г.). Як бачым, ключавым словам журналісты выбралі слова «скінхеды» (брытагаловыя), пад гэтым тэрмінам хаваецца пэўны змест пэўнай ідэалогіі грамадскага руху, а значыць, межы лаканічнага загалоўка наўмысна і абгрунтавана пашыраюцца. Калі аўтар «Народнага слова» выбірае шлях звычайнага пераказу тых злачынных эпізодаў, на якіх засяродзіла ўвагу папярэдняе следства, і ў чым абвінавачваюцца маладыя людзі, то аўтар «Віцьбічаў» больш палемічны, калі разважае, наколькі выпадковымі маглі быць дзеянні непаўналетніх хлапчукоў, аб чым, дарэчы, яны самі спрабавалі заявіць перад судом.

Характэрнай рысай судовага нарыса з'яўляецца рэканструкцыя складу злачынства, калі даецца не прававая ацэнка, а маральная. Асаблівае значэнне тут набывае свядомасць самога аўтара. У прафесійную свядомасць журналіста ўваходзяць як атрыманыя веды, так і гуманітарныя каштоўнасці, нацыянальныя і прафесійныя традыцыі. Не сакрэт, што сёння маральная тэматыка трансфармуецца разам з пераменамі ў грамадстве. Сутнасць маралі складае, паводле Г.В. Лазуцінай, добрая воля індывіда да ўзгаднення сваіх дзеянняў з інтарэсамі супольнасці [4]. Хрысціянская канцэпцыя маральнага выбару зыходзіць з разумення паняцця грахоўнасці. І гэта таксама набывае новае актуальнае гучанне. Філасофская ўстаноўка разглядаць мараль як з'яву сацыяльную, дазваляе ўбачыць сістэму сувязі маралі і журналістыкі. Па-першае, мараль, маральныя адносіны ў грамадстве ёсць прадмет адлюстравання журналістыкі. Па-другое, і мараль, і журналістыка выступаюць у якасці інструмента ў адносінах адзін да аднога. Наколькі здольны сучасны журналіст аб'ектыўна адлюстроўваць складаныя калізіі і тэндэнцыі грамадства на пераходным этапе, залежыць ад яго ўласнай маральнай устаноўкі, сістэмы ўнутраных схільнасцей да выканання маральнага закона, гатоўнасці дзейнічаць у адпаведнасці з ім. Менавіта тканіна нарыса з'яўляецца найбольш аптымальнай тэкставай прасторай для прэзентацыі маральнай праблематыкі сучаснасці. Спалучэнне вербальнай і невербальнай інфармацыі ў нарысе выконвае функцыянальную задачу мастацка-публіцыстычнага тэксту: выкрываць схаванае, нябачнае ў рэчаіснасці, рэканструяваць гэты фон у межы моўна-знакавай паслядоўнасці, уплываць на розныя ўзроўні ўспрымання аўдыторыі. Публіцыстычнасць – гэта і ацэначнасць, і эмацыянальнасць. Ацэнка ў публіцыстыцы мае не індывідуальны, а сацыяльны характар [5].

Найбольш апраўданы шлях збору матэрыялу – непасрэдная прысутнасць журналіста на судовых працэсах. Аднак гэта даволі працаёмкі шлях. Многія вопытныя журналісты абмяжоўваюцца адным днём прысутнасці ў зале судовых пасяджэнняў, а потым, дачакаўшыся прысуду, просяць дазволу суддзі прачытаць матэрыялы справы самастойна.

Звычайна кожны новы тэкст – вынік асобнай індывідуальнай журналісцкай работы, у аснове якой знаходзіцца творчы пошук ад моманту ўзнікнення задумы да рэалізацыі яе праз кампазіцыйную пабудову публіцыстычнага твора. Б.В. Стральцоў лічыць, што падзеі, эпізоды з жыцця дзеючых асоб, канфліктныя сутыкненні, здарэнні служаць факталагічнай асновай для мастацка-публіцыстычнага вобраза, распрацоўкі сітуацыйнай канцэпцыі розных сфер грамадскага жыцця [6]. Адсюль вынікае, што ў судовым нарысе пэўная сфера міжасабовых адносін набывае грамадскае гучанне, калі яна выходзіць за рамкі этычных і прававых норм. У нарысе важна не толькі паказаць логіка-вобразную панараму суб'ектыўна-аб'ектыўных адносінаў паміж асобамі, але і даказаць, што выбраная вамі для прэзентацыі канцэпцыя гэтых адносін заслугоўвае маральнага асуджэння і прававога пакарання. Цікавым у гэтай сувязі падаецца меркаванне С.К. Шайхітдзінавай «... в журна-

листской деятельности случаются ситуации, когда этические нормы и нормы права входят в противоречие. Вопрос о границах социальной значимости той или иной информации, когда ситуация перестает быть типичной, журналисты каждый раз решают индивидуально» [7].

*Разгледзім два асноўныя шляхі збору інфармацыі для судовага нарыса, а таксама некалькі варыянтаў праяўлення творчай індывідуальнасці аўтараў медыя-тэкстаў.*

Шлях першы: непасрэдны ўдзел у судовых пасяджэннях, назіранне за паводзінамі ў зале суда за абвінавачваемымі, пацярпеўшымі, аналіз паказанняў сведкаў, выступленняў пракурора і адваката. Звычайна зала суда ператвараецца ў тэатральную сцэну, на падмостках якой разыгрываецца сапраўдная драма ці трагедыя жыцця. Журналісту варта не паддацца ўласным эмоцыям пры сутыкненні з адваротным бокам рэчаіснасці, а выпрацаваць уласную лінію прафесійных паводзін, уласную канцэпцыю праекцыі судовага следства ў тэксце.

Вясной 2003 года ў Віцебскім абласным судзе слухалася неардынарная справа трох непаўналетніх дзяўчат, якія ўчынілі замах на забойства сваёй жа сяброўкі-равесніцы. Журналісты пільна сачылі за тым, як разгортваюцца падзеі ў зале суда. Пасля вынясення прысуду ў абласной газеце «Народнае слова» з'явіўся нарыс «Сбросьте ее с моста...» (8.05.2003 г.), у газеце «Віцьбічы» – «Преступление по сценарию матери» (22.05.2003 г.). Абодва тэксты істотна адрозніваюцца адзін ад аднаго. Назва першага нагадвае жорсткі дэтэктыў, уяўляе згустак агрэсіі як выклік традыцыйным стылям газетнай публіцыстыкі. Аўтар тэксту канцэнтруецца вакол сюжэта злачынства, пакідаючы невербальную інфармацыю паміж радкоў, не выпісвае дэталі і падрабязнасці, але робіць дакладныя псіхалагічныя акцэнты на матывацыі злачынства і анатоміі зла. Лаканічнасць – наўмысна падкрэслены аўтарскі выбар: злачынны факт сам па сабе настолькі абураючы, дзікі і незвычайны, што яму не патрэбны лішні антураж. Пяць кароткіх частак маюць адпаведна сціслыя назвы: «Переходный возраст», «Мамин самогон», «Не ведали, что творили», «Покушение», «Наказание». Трое сябровак летняй ноччу скінулі чацвёртую з высокага маста ў Заходнюю Дзвіну. Але здзейсніць жудасны ўчынак натхніла і дапамагла маці адной з дзяўчынак.

Менавіта гэты канцэпт выбірае ключом да нарыса «Преступление по сценарию матери» Галіна Міронава. Аўтар выводзіць у цэнтр не праблему юнай жаночай злачыннасці (што само па сабе несумяшчальна), а праблему ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей.

Шлях другі – завочнае знаёмства з падзеямі і эпізодамі жыцця герояў нарыса праз дакументальныя крыніцы інфармацыі – чытанне крымінальнай справы, калі вы не маеце магчымасці сустрэцца з удзельнікамі вывучаемага вамі канфлікту, назіраць за імі непасрэдна ў жыцці. На што варта звярнуць увагу пры журналісцкім праглядзе крымінальнай справы?

1. Не варта адразу пачынаць з чытання прысуду, як гэта робяць кваліфікаваныя юрысты. Гэта можа ўнесці большы сумбур у журналісцкім уяўленні пра лагічнасць і паслядоўнасць вывучаемых падзей.

2. Найбольш аб'ектыўная інфармацыя па крымінальнай справе можа знаходзіцца менавіта на першых старонках справы, калі следчыя органы праводзяць першыя допыты сведкаў. У далейшым паказанні сведкаў могуць быць зменены, але на першай размове яны больш шчырыя.

3. Несумненнай увагай з боку ўдумлівага нарысіста карыстаецца заключэнне судова-псіхіятрычнай экспертызы. Яно дазваляе журналісту паглыблена пазнаёміцца з асобай, якая ўчыніла злачынства і, магчыма, зрабіць свае вывады наконт матывацыі дадзенага ўчынку.

Але часта ўсё ж такі бывае, калі менавіта прысуд з'яўляецца першай крыніцай інфармацыі, з якой пачынаецца працэс журналісцкай творчасці. Як найбольш эфектыўна скарыстаць момант засваення матэрыялу? Журналіст апынаецца перад выбарам: на што звярнуць увагу пры чытанні незнаёмага тэксту. Работа ўскладняецца, калі журналіст абмежаваны рамкамі часу. Правядзём параўнальны аналіз двух тэкстаў, напісаных па выніках разгляду адной судовай справы двума рознымі аўтарамі.

8 лютага 2003 года ў газеце «Народнае слова» з'яўляецца публіцыстычны тэкст з шакіруючым загалоўкам-фікцыяй (сацыяльнай устаноўкай) «Обыкновенный садизм». У свядомасці многіх сучаснікаў добра засела назва выдатнейшай дакументальнай кінастужкі «Обыкновенный фашизм». У гэтым словазлучэнні – не жах, а глыбокая іронія над чалавечымі праявамі зла. Кароткі лід адразу вырашае некалькі задач: паведамляе сутнасць тэмы, інтрыгуе, заклікае чытаць газетную публікацыю.

«Коллегия по уголовным делам областного суда приступила к слушанию дела об убийстве восьмилетнего ребенка в поселке Осинторф Дубровенского района. Человека, совершившего жестокое убийство, на сей раз не пришлось разыскивать правоохранительным органам: он сам позвонил в милицию и сказал, что в его доме умер пасынок-первоклассник». Канцэптуальная задача, якую спрабуе вырашыць аўтар, заключаецца ў пошуку феномена зла, спраецыраванага на нявіннае дзіця. Пра гэтае зло аўтар бескампрамісна заяўляе адразу ў пачатку невялічкага нарыса, паведаміўшы чытачу, што судова-медыцынская экспертыза налічыла на целе дзіцяці 84 сляды ад удараў. Суровая рэальнасць падзей, з якімі сутыкнуўся журналіст, чытаючы старонку за старонкай крымінальную справу, прамусіла яго сказаць пра гэта без лішніх слоў і апісанняў.

Пасля стварэння адпаведнай карціны з біяграфічных дадзеных асоб-удзельнікаў далейшых падзей журналіст адразу прыступае да аповеду пра той самы злашчасны дзень.

Аўтар наўмысна канцэнтруе ўвагу на кантрастных дэталях і абставінах: співаючыся, дарослыя ўцягваюць у п'янае кола маладых, у іх няма больш ніякіх клопатаў, акрамя выпіўкі... Але ж побач – памкненне да звычайнага чалавечага жыцця: яны даглядаюць свойскую жывелу, частуюць малодшага цукеркамі. Кантрасты ствараюць больш выразныя вобразы, аб'ектывізуюць рэчаіснасць. Журналіст не ставіць перад сабой задачу аднавіць у тэксце храналогію жорсткіх пабояў садыста-айчыма. Мысленне аўтара вышэй за гэтае. Дастаткова зарыентаваць чытача, уключыць яго ўяўленне аб тым, што адбывалася ў страшным доме.

Уважлівае чытанне заключэння судова-псіхіятрычнай экспертызы прывяло аўтара да высновы, у чым крыюцца прычыны такога садызму. Эксперты прызналі Міхаіла хранічным алкаголікам, алкаголь параджае шалёную агрэсію.

Іншая канцэпцыя нарыса прасочваецца ў гарадской газеце «Віцьбічы» («Жестокость» – 15 мая 2003 года). Спачатку аўтар рамантызуе дзяцінства маленькага Дзянііскі, уводзячы ў тэкставую тканіну вобраз прыстані і парахода, ствараючы акцэнт на моцнай прыхільнасці хлопчыка да маці. Такі прыём расчуліць чытача лічу неапраўданым, бо далей гэтыя ўстаноўкі не распрацоўваюцца, затое аўтар рэаніміруе жорсткасць, каб зноў-такі эмацыянальна закрануць чытача.

«– На, побей за меня, – приказал Михаил и передал ремень Сергею. А сам в это время обул сапоги и стал бить мальчишку куда попало. Денис кричал (как потом установит следствие) до кровоизлияния в голосовых связках».

Жорсткі натуралізм апісання можа наадварот не прыцягнуць, а адштурхнуць чытача. Сёння хутчэй выйграе той, хто не збіраецца здзіўляць дэталізацыяй гвалту, а ўдумліва шукае новы падыход да тэкставай трансфармацыі складу злачынства з улікам норм прафесійнай этыкі і прынцыпаў агульначалавечай маралі.

Сёння многія новыя медыя-тэксты маюць спецыфічны тэмпарытм, для якога не характэрна лішняя інфармацыйная сэнсавасць, размытасць слоў і думак, пераважвае лаканізм, перарывістасць выкладання, патаемны ўплыў на газетную стылістыку павуціна-тэксту (Інтэрнэт).

Галоўнай задачай журналіста ў судовым нарысе з'яўляецца не проста рэканструкцыя злачынства, а раскрыццё феномена чалавечага зла. Таму аналіз матываў злачынства набывае ў новай журналістыцы першаснае значэнне. Найбольш складаная задача – адлюстраваць падзеі, якія прывялі да судовай справы, аб'ектыўна і праўдзіва. Дзеля гэтага могуць быць выкарыстаны і невербальныя сродкі вывучэння рэчаіснасці.

Пытанне аб цэласнасці і звязанасці тэксту вядзе да яго змястоўнасці і структурнай арганізацыі. Менавіта судовы нарыс утрымлівае ў сабе ўсемагчымыя семантычныя пераўтварэнні для стварэння розных узроўняў успрымання тэксту аўдыторыяй: тэкст у тэксце, аўтарскі маналог, дыялог, аповед. Творчыя задачы нарысіст вырашае з дапамогай лагічнага аналізу, а мастацкім вобразам у нарысе можа з'яўляцца алгарытм паводзін чалавека ў экстрэмальнай сітуацыі ці абстрактнае паняцце агульнага няшчасця. Псіхалагічны пачатак у публіцыстыцы абумоўлены наступнымі фактарамі:

1. Узрастае цікавасць да ўнутранага свету чалавека.
2. Накіраванасць не толькі на апісанне сацыяльна дэтэрмінаваных учынкаў асобы, але і на душэўныя праявы чалавека.
3. Узрастае роля суб'ектыўнага фактару ў сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці [8].

Псіхалагічны кампанент становіцца найважнейшым элементам вывучэння тэорыі нарыса і ў якасці інструмента пошуку інфармацыі, і пры кампазіцыйнай пабудове журналісцкага тэксту.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Брэтон Ф., Пру С.*** Выбух камунікацыі. Мн., 1995. С. 31.
2. ***Дубовік С.*** Сацыяльны патэнцыял беларускай перыёдыкі. Мн., 2000. С. 52.
3. ***Прохоров Е.П.*** Структура и проблемы деонтологии журналистики // Вест. Моск. ун-та. Серия 10, 2002, № 4. С. 6.
4. ***Лазутина Г.В.*** Профессиональная этика журналиста. М., 2000. С. 17.
5. ***Валгина Н.С.*** Теория текста. М., 2003. С. 213.
6. ***Стральцоў Б.В.*** Метад і жанр. Асновы творчага майстэрства журналіста. Мн., 2002. С. 16.
7. ***Шайхитдинова С.К.*** Гносеология медиаэтики: организационная культура или «голос совести» // Вест. Моск. ун-та. Серия 10. 2002. № 4. С. 39.
8. ***Стюфляева М.И.*** Человек в публицистике. Воронеж, 1989. С. 58.



## SUMMARY

*The Court feature is in great demand of the reading public today. The experience basedon tradition is somewhat ignored under the new multimedia circumstances.*

*At the same time the systemforming chain «journalist – the source of information – reality – character» is considered from the point of view of Deontology as the Science of Morale. The author considers two basic ways of gathering information for the Court feature, emphasizing it on the basis of phenomenalogical approach.*


*Поступила в редакцию 28.11.2003*